

## Яка́я лі́тара закры́та малю́нкамі?



палю́ — паль 

салю́ — саль 

### Параўна́й!

Я **палю́** кве́ткі.

Я **палью́** кве́ткі.

Я **салю́** бу́льбу.

Я **салью́**  .




ья
ью
ьё
ье
ьі

Улья́на
пралью́
павільён
атэлье́

Ле́ра
Вале́ра
валье́ра



Каля́ валье́ры Вале́ра і Ле́ра.

с л м а і ы у ў г п т о э р ч н

## Ю́ныя танцо́ры

Улья́на і Я́нка — сябры́. Яны́ танцо́ры. Праз ме́сяц вы-сту-пле́-нне. Пасля́ ўро́каў Улья́на і Я́нка ра́зам рэ-пе-ці́-ру-юць свой ба́льны та́нец.



Ма́ма Улья́ны май-стру́-е касцю́м сваі́мі рука́мі. У́ля апране́ ба́льную суке́нку. У валасы́ яна́ ўпляце́ я́ркую кве́тку. У Я́нкі ёсць бе́лая саро́чка, по́яс і ба́бачка. Касцю́м з ка-мі-зэ́ль-кай яму́ заказа́лі ў атэлье́.

У за́ле лье́цца му́зыка. Ляця́ць у ва́льсе Улья́нка і Я́нка. Як прые́мна назіра́ць за ю́нымі танцо́рамі!



Які́ та́нец рэпеці́равалі Я́нка і Улья́на?



Ці быва́е ло́тацць чырво́най? Чаму́ так атрыма́лася?



ло́тацць

к й я ю е ё з в б ц ь



Правообладатель Академия образования